Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар БДУКМ
____________________ Ю. П. Бондар
«_____»______________ 2014 г.
Рэгістрацыйны №-ВД-____/ баз.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЭОРЫЯ І ГІСТОРЫЯ РЭЖЫСУРЫ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці*
*1-18 01 01-03 Народная творчасць (тэатральная)*

Мінск
БДУКМ
2014

**СКЛАДАЛЬНІК**
*І. А. Алексніна,* дацэнт кафедры тэатральнай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*А. С. Бохан,* прарэктар па вучэбнай рабоце ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт;
*А. Я. Корсакава,* дацэнт кафедры беларускай і сусветнай культуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
кафедрай тэатральнай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 2 ад 25.09.2013 г.);
прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 1 ад 10.10. 2013 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: І. А. Алексніна

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Выкладанне вучэбнай дысцыпліны «Тэорыя і гісторыя рэжысуры» грунтуецца на лепшых дасягненнях тэарэтычнай думкі ў галіне гісторыі, тэорыі, метадалогіі і практыкі прадстаўнікоў нацыянальнай, рускай і замежнай рэжысёрскіх школ: К. С. Станіслаўскага, Ул. І. Немiровiча-Данчанкi, М. В. Кнэбель, Ус. Э. Меерхольда, А. Д. Папова, Б. Я. Захавы, Г. А. Таўстаногава, Р. І. Баравіка, І. С. Папова, В. М. Раеўскага, Б. І. Луцэнкі і інш.

Выкладанне вучэбнай дысцыпліны «Тэорыя і гісторыя рэжысуры» знаходзіцца ў цеснай сувязі з іншымі спецыяльнымі дысцыплінамі, такімі як «Рэжысура», «Рэжысёрскае мастацтва ў кантэксце сучасных тэатральных працэсаў», «Сцэнічнае мастацтва XX стагоддзя», а таксама курса «Гісторыя мастацтваў: тэатральнае».

*Мэтай* вывучэння вучэбнай дысцыпліны з’яўляецца знаёмства студэнтаў з тэорыяй і гісторыяй беларускай, рускай і замежнай рэжысуры, а таксама выпрацоўка тэрміналагічнага апарату, што неабходна для высакаякаснай падрыхтоўкі спецыяліста: арганізатара тэатральнай дзейнасці, рэжысёра і выкладчыка спецыяльных тэатральных дысцыплін у яго самастойнай прафесійнай дзейнасці.

*Задачы* дысцыпліны:

– вывучыць умовы станаўлення і развіцця прафесіі «рэжысёр»;

– засвоіць гісторыю заходнееўрапейскай, беларускай і рускай рэжысуры і пазнаёміцца з яе асноўнымі тэарэтычнымі і практычнымі дасягненнямі;

– авалодаць методыкай работы рэжысёра над драматургічным творам, стварэннем рэжысёрскага пастановачнага плана (эксплікацыі) спектакля.

У выніку засваення дысцыпліны «Тэорыя і гісторыя рэжысуры» студэнты павінны *ведаць:*

– асаблівасці прафесіі «рэжысёр», умовы станаўлення і развіцця яе ў Беларусі і за яе межамі;

– гісторыю, тэорыю і метадалогію рэжысёрскага мастацтва ў Беларусі, Расіі і краінах Заходняй Еўропы;

– методыку работы рэжысёра ў працэсе стварэння рэжысёрскай задумы (канцэпцыі) і пастаноўкі спектакля;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*умець:*

– выкарыстоўваць тэарэтычныя і практычныя веды, атрыманыя ў час засваення дысцыпліны «Тэорыя і гісторыя рэжысуры», на практыцы;

– выкарыстоўваць атрыманыя веды ў працэсе кіраўніцтва тэатральным калектывам або (і) выкладчыцкай дзейнасці.

У ліку эфектыўных педагагічных тэхналогій, якія спрыяюць засваенню студэнтамі ведаў і ўменняў па вучэбнай дысцыпліне «Тэорыя і гісторыя рэжысуры», развіццю ў студэнтаў аналітычнага мышлення, можна выдзеліць наступныя *тэхналогіі:*

– правядзенне вучэбна-творчых дыскусій, дэбатаў, публічных выступленняў па праблемах тэорыі і гісторыі рэжысуры;

– падрыхтоўка мультымедыйных прэзентацый па праблемах гісторыі, тэорыі і методыкі тэатральнага мастацтва.

У межах вывучэння дысцыпліны «Тэорыя і гісторыя рэжысуры» мяркуецца правядзенне студэнтамі самастойнай работы па азнаямленні з асноўнай і дадатковай літаратурай па гісторыі і тэорыі рэжысуры, з выданнямі перыядычнага друку па праблемах гісторыі, тэорыі і практыкі рэжысуры, наведванне тэатральных спектакляў дзяржаўных і прыватных тэатраў, фестываляў тэатральнага мастацтва ў Рэспубліцы Беларусь.

Кантроль за самастойнай работай студэнтаў у працэсе засваення дысцыпліны «Тэорыя і гісторыя рэжысуры» ажыццяўляецца ў час правядзення практычных і семінарскіх заняткаў.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Тэорыя і гісторыя рэжысуры» адводзіцца ўсяго 150 гадзін (з іх 92 гадзіны – аўдыторныя заняткі, 32 гадзіны – лекцыйныя заняткі, 30 гадзін – практычныя заняткі і 30 гадзін – семінарскія заняткі).

Рэкамендаваныя формы кантролю ведаў студэнтаў – залікі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | практ. зан. | сем. зан. |
| Уводзіны | 2 | 2 | -- | -- |
| **Раздзел I. Гісторыя рэжысуры** | | | | |
| *Тэма 1.* Зараджэнне, станаўленне і асаблівасці прафесіі «рэжысёр» | 4 | 2 | 2 | -- |
| *Тэма 2.* Гісторыя заходнееўрапейскай рэжысуры (XIX – канец XX ст.) | 12 | 2 | 4 | 6 |
| *Тэма 3.* Гісторыя рускай рэжысуры (XIX – канец XX ст.) | 12 | 2 | 4 | 6 |
| *Тэма 4.* Гісторыя беларускай рэжысуры (XIX – канец XX ст.) | 12 | 2 | 4 | 6 |
| *Тэма 5.* Рэжысура ў кантэксце сучасных тэатральных працэсаў | 22 | 12 | 6 | 4 |
| **Раздзел II. Тэорыя рэжысуры** | | | | |
| *Тэма 6.* Рэжысёрскі аналіз п’есы | 10 | 4 | 2 | 4 |
| *Тэма 7.* Рэжысёрская задума і эксплікацыя спектакля | 16 | 4 | 8 | 4 |
| *Тэма 8.* Асноўныя этапы работы рэжысёра над спектаклем | 2 | 2 | -- | -- |
| **Разам...** | **92** | **32** | **30** | **30** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

*Уводзіны*

Мэта і задачы дысцыпліны «Тэорыя і гісторыя рэжысуры». Тэарэтыка-метадалагічная база дысцыпліны. Вучэбна-метадычнае забеспячэнне выкладання дысцыпліны. Асноўная і дадатковая літаратура па дысцыпліне. Патрабаванні да залікаў.

Заснавальнікі і найбольш знакамітыя прадстаўнікі беларускай, рускай і замежнай рэжысёрскай школы і іх уклад у развіццё тэатральнага мастацтва нашай краіны і замежжа. Ул. І. Неміровіч-Данчанка аб трох функцыях дзейнасці рэжысёра. Погляды на рэжысёрскую прафесію М. В. Кнэбель, Ус. Э. Меерхольда, Б. Брэхта, Г. Таўстаногава, А. Эфраса, Б. Луцэнкі, В. Раеўскага і інш.

### Раздзел І. Гісторыя рэжысуры

*Тэма 1. Зараджэнне, станаўленне і асаблівасці прафесіі «рэжысёр»*

Тэрмін «рэжысёр». Паходжанне і сутнасць. Кароткі экскурс у гісторыю зараджэння і станаўлення рэжысёрскай прафесіі. Роля рэжысёра ў тэатральным мастацтве: гісторыя і сучаснасць. Патрабаванні да асобы рэжысёра і неабходныя прафесійныя якасці для заняткаў гэтай прафесіяй.

Выдатнейшыя прадстаўнікі гэтай прафесіі (Г. Лаўбэ, Ч. Кін, А. Антуан, О. Брам, М. Рэйнхардт, К. Станіслаўскі, Ус. Меерхольд, Я. Вахтангаў, А. Таіраў, Э. Крэг, Э. Піскатар, Б. Брэхт, П. Брук, Е. Гратоўскі, Дж. Стрэлер, П. Штайн, Г. Таўстаногаў, Ю. Любімаў, А. Эфрас, М. Захараў, Ю. Бутусаў, П. Фаменка, Ф. Ждановіч, У. Галубок, Л. Літвінаў, Е. Міровіч, К. Саннікаў, Б. Эрын, В. Раеўскі, Б. Луцэнка і інш.).

Іх уклад у развіццё тэатральнага мастацтва Беларусі і замежных краін.

*Тэма 2. Гісторыя заходнееўрапейскай рэжысуры (XIX – канец XX ст.)*

Г. Лаўбе – кіраўнік «Бург-тэатра» і ўплыў яго дзейнасці на развіццё рэалістычных традыцый у аўстрыйскім тэатры і выдзяленне рэжысуры ў асобную прафесію (1850). Ч. Кін – кіраўнік лонданскага тэатра «Прынцэз» (1850) і ўплыў яго дзейнасці на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выдзяленне рэжысуры ў асобную прафесію. Л. Кронэк і Мейнінгенскі тэатр (1866–1891). Наватарства Кронэка ў рэжысуры і ўплыў дзейнасці гэтага тэатра на развіццё сусветнага тэатра. «Свабодны тэатр» А. Антуана ў Парыжы (1887–1894) і «Свабодная сцэна» О. Брама ў Берліне (1989–1992). Уплыў дзейнасці гэтых тэатраў на напрамкі развіцця сучаснай рэжысуры. Асаблівасці рэжысуры М. Рэйнхардта і замацаванне ў ёй тэндэнцый сцэнічнага рэалізму. «Ідэальны тэатр» Э.-Г. Крэга і ўплыў яго ідэй на сусветнае тэатральнае мастацтва. Уплыў рэжысёрскай дзейнасці Ж. Капо на развіццё прафесіі. Ш. Дзюлен – кіраўнік і рэжысёр тэатра «Атэлье» (1922). «Палітычны тэатр» Э. Піскатара. Працяг і развіццё ідэй Э. Піскатара ў творчай дзейнасці Б. Брэхта. Тэорыя «эпічнага тэатра» Б. Брэхта. Рэжысура і погляды на сучаснае тэатральнае мастацтва П. Брука і Дж. Стэлера. Е. Гратоўскі – рэжысёр-эксперыментатар. Рэжысёрская дзейнасць П. Штайна і яго супрацоўніцтва з рускім тэатрам у другой палове XX ст.

### *Тэма 3. Гісторыя рускай рэжысуры (XIX – канец XX ст.)*

К. С. Станіслаўскі – рэжысёр, акцёр і педагог. Асноўныя этапы творчай дзейнасці. Адкрыццё (сумесна з Ул. І. Немировічам-Данчанка) і праца ў Маскоўскім Мастацкім акадэмічным тэатры (МХАТ). Уплыў творчай спадчыны Мейнінгенскага тэатра на погляды К. Станіслаўскага. Рэжысёрскія работы К. Станіслаўскага. Асаблівасці яго метаду работы з акцёрам і ўплыў яго ідэй на сусветнае і беларускае тэатральнае мастацтва. Выкарыстанне прынцыпаў жыццёвай верагоднасці і сцэнічнага рэалізму ў акцёрскіх работах Г. Глебава, У. Дзядзюшкі, І. Ждановіч, А. Ільінскага, П. Малчанава, Б. Платонава, Л. Рахленкі, Л. Ржэцкай, Ц. Сяргейчыка, Ф. Шмакава і інш.; спектаклях Ф. Ждановіча, М. Міцкевіча, І. Папова, К. Саннікава і інш.

Тэарэтычныя распрацоўкі ідэй рэжысёра-педагога Ул. І. Немировіча-Данчанкі аб творчасці акцёра, «зерні» і «трох праўдах» у спектаклі. Рэжысёрскія работы Ул. І. Немировіча-Данчанкі. Уплыў дзейнасці Ул. І. Немировіча-Данчанкі на рэпертуарную палітыку МХАТ.

Я. Б. Вахтангаў і Першая студыя МХАТ. Лепшыя работы Вахтангава-рэжысёра. Наватарства рэжысёрскіх прыёмаў Я. Вахтан-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гава. Адкрыццё тэатра імя Я. Вахтангава (1926). Уплыў яго дзейнасці на беларускі тэатр.

Наватарства Ус. Э. Меерхольда (Меергольд) у рэжысуры. Работы ў кіно. Меерхольд-педагог. Выкладанне на курсах сцэнічнага майстэрства (Петраград, 1918–1919). Адкрыццё тэатра імя Ус. Э. Меерхольда (1923). Уплыў тэарэтычных поглядаў і практычных пошукаў Меерхольда на творчасць расійскіх (Ю. Любімаў) і беларускіх (Л. Літвінаў, Н. Лойтар, В. Пацехін і інш.) рэжысёраў.

А. Я. Таіраў – рэжысёр. Адкрыццё Камернага тэатра (сумесна з А. Коанен, 1914). Спектаклі Камернага тэатра. Наватарства Таірава-рэжысёра. Яго погляды на тэатральнае мастацтва. Уплыў ідэй Таірава на далейшае развіццё тэатральнага мастацтва, у тым ліку і беларускага.

Г. А. Таўстаногаў – рэжысёр і педагог. Пачатак сцэнічнай дзейнасці. Праца рэжысёрам Рускага драматычнага тэатра імя А. Грыбаедава (Тбілісі, 1938–1946) і Цэнтральнага дзіцячага тэатра (Масква). Пастаноўкі ў іншых тэатрах (Гастрольны рэалістычны, Студыя тэатра аперэты, «Ленком» і інш.). Узначальванне Вялікага драматычнага тэатра імя Горкага (БДТ, пазней – імя Г. Таўстаногава) і спектаклі на сцэне БДТ. Умацаванне трупы вядучымі майстрамі сцэны. Лепшыя работы тэатра ў 1960-я, 1970-я і 1980-я гг. Праца Таўстаногава ў якасці рэжысёра-пастаноўшчыка за мяжой, на радыё і тэлебачанні. Тэарэтычная спадчына Г. Таўстаногава. Шматгадовая праца ў Ленінградскім дзяржаўным інстытуце тэатральнага мастацтва і кіно (сёння – Санкт-Пецярбургская дзяржаўная акадэмія тэатральнага мастацтва) і фарміраванне метадалогіі выкладання рэжысуры. Педагагічныя дасягненні Таўстаногава.

А. М. Яфрэмаў – рэжысёр і педагог. Сканчэнне Школы-студыі МХАТ і праца ў якасці рэжысёра Цэнтральнага дзіцячага тэатра і выкладчыка Школы-студыі МХАТ (з 1976 г. – прафесар Школы-студыі МХАТ). Стварэнне і ўзначальванне тэатра «Сучаснік» (1956). Праца ў якасці акцёра і галоўнага рэжысёра МХАТ СССР імя М.Горкага (з 1970 г.). Найбольш вядомыя работы гэтага перыяду. Праца ў кіно ў якасці акцёра і рэжысёра.

А. В. Эфрас – рэжысёр і педагог. Вучоба ў Студыі тэатра імя Массавета, ДІТМ (1950). Праца ў перасоўным тэатры М. В. Кнэбель, пазней – у Разані і Цэнтральным дзіцячым тэатры (Масква).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праца чарговым рэжысёрам у Маскоўскім драматычным тэатры на Малай Броннай і ўдасканаленне рэжысёрскага стылю. Спектаклі А. Эфраса гэтага перыяду. Прызначэнне галоўным рэжысёрам Маскоўскага тэатра драмы і камедыі на Таганцы. Спектаклі «таганскага» перыяду. Тэарэтычная спадчына рэжысёра.

Рэжысура Ю. П. Любімава. Праца ў якасці акцёра ў Студыі МХАТ-2 (1934). Вучоба ў тэатральным вучылішчы пры Тэатры імя Я. Б. Вахтангава (1936). Служба артыстам Ансамбля песні і пляскі НКВД (1941–1945). Любімаў – вядучы акцёр Тэатра імя Я. Вахтангава (1946–1964). Рэжысёрскі дэбют на сцэне Тэатра імя Я. Б. Вахтангава. Пастаноўка «Добрага чалавека з Сезуана» Б. Брэхта – пачатак Тэатра на Таганцы. Лепшыя спектаклі Тэатра на Таганцы. Асаблівасці творчай дзейнасці Тэатра на Таганцы ў «любімаўскі» перыяд. Праца Любімава на іншых тэатральных пляцоўках свету. Гады эміграцыі і праца на пляцоўках Аўстрыі, Англіі, ЗША, Італіі. Вяртанне Любімава ў Расію і Тэатр на Таганцы. Спектаклі апошняга перыяду яго кіраўніцтва тэатрам (да 2011 г.).

Рэжысура М. А. Захарава. Вучоба на акцёрскім факультэце Дзяржаўнага інстытута тэатральнага мастацтва (ДІТМ, 1951), паралельная праца на сцэнах тэатраў імя У. Маякоўскага і М. Ярмолавай. Праца ў Пермскім абласным драматычным тэатры (1955–1959). Станаўленне Захарава-рэжысёра і ўзначальванне Маскоўскага тэатра імя Ленінскага камсамола (з 1973 г. – «Ленком»). Лепшыя спектаклі тэатра і яго замежная гастрольная дзейнасць. Педагагічная рэжысура ў Дзяржаўным інстытуце тэатральнага мастацтва (з 1983 г.).

### *Тэма 4. Гісторыя беларускай рэжысуры (XIX – канец XX ст.)*

В. І. Дунін-Марцінкевіч – пачынальнік беларускага нацыянальнага тэатра. Творчы шлях драматурга. Першая спроба стварэння беларускага тэатра (фальварак Люцынка, 1840). Драматургія Дуніна-Марцінкевіча. Стылістычныя асаблівасці твораў. Уздзеянне тэатральных твораў В. Дуніна-Марцінкевіча на фарміраванне беларускай нацыянальнай драматургіі. Развіццё тэатральных традыцый В. Дуніна-Марцінкевіча ў беларускім нацыянальным тэатры пачатку XX ст.

Першая беларуская трупа І. Ц. Буйніцкага. Асаблівасці тэатральных пастановак Буйніцкага. Рэпертуар тэатра Буйніцкага.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рост мастацкага ўзроўню тэатра Буйніцкага, гастролі ў Пецярбург, Варшаву. Акцёрскія работы Буйніцкага. Роля І. Буйніцкага ў справе пашырэння беларускай культуры і прафесіяналізацыі тэатральнага мастацтва.

Ф. К. Аляхновіч (псеўд. Ю. Монвід) – вядомы тэатральны дзеяч, драматург, акцёр і рэжысёр. Праца акцёрам у вандроўнай польскай трупе, пасля – у Вільні (1910). Першая беларуская вечарынка ў Вільні. Арганізацыя Беларускай драматычнай дружыны ў Вільні і пастаноўка шэрагу п'ес (у тым ліку і аўтарскіх). Праца ў Мінску (Першае таварыства беларускай драмы і камедыі, 1918), кіраўніцтва трупай аматараў і пастаноўка купалаўскай «Паўлінкі». Праца ў Беларускім савецкім тэатры (1918–1919). Арганізацыя Беларускага народнага тэатра ў Мінску (канец 1919). Выкарыстанне драматургічнай спадчыны Аляхновіча іншымі рэжысёрамі. Ф. Аляхновіч – першы гісторык беларускага тэатра (гістарычны нарыс «Беларускі тэатр», 1924).

Рэжысёрская і арганізатарская дзейнасць Ф. П. Ждановіча – кіраўніка і рэжысёра Першага таварыства беларускай драмы і камедыі (1917–1920, у 1918–1919 гг. – Беларускі савецкі тэатр). Традыцыі беларускага народнага тэатра і І. Буйніцкага ў пастаноўках Ждановіча. Супрацоўніцтва таварыства з У. Галубком. Ф. Ждановіч і трупа БДТ-1 (1920–1921): выступленні ў якасці вядучага акцёра трупы (1922–1929). Пастаноўкі Ф. Ждановіча ў Беларускім дзяржаўным вандроўным тэатры. Роля таварыства і асабіста Ф. Ждановіча ў развіцці нацыянальнага прафесійнага тэатра Беларусі.

Е. А. Міровіч (Е. А. Дунаеў) – акцёр, рэжысёр, драматург і педагог, адзін са стваральнікаў беларускага савецкага тэатра. Акцёр Пецярбургскага Александрынскага тэатра (з 1900 г., з 1919 г. – у Беларусі). Мастацкі кіраўнік (1921–1931) і рэжысёр (1941–1945) Беларускага тэатра імя Я.Купалы, іншых беларускіх тэатраў, педагог Рэспубліканскага тэатральнага вучылішча (1938–1941) і Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута (з 1945 г.). Асаблівасці драматургічнай творчасці Міровіча-драматурга. Рэжысёрскія распрацоўкі Е. Міровіча. Увага да рэпертуару, у тым ліку да арыгінальных беларускіх твораў. Роля Е. Міровіча ў фарміраванні беларускай нацыянальнай акцёрскай школы і рэжысуры.

М. А. Міцкевіч – акцёр Першага беларускага таварыства драмы і камедыі Ф. Ждановіча (1918–1920). Вучоба ў Беларускай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

драматычнай студыі ў Маскве (1926). Праца ў Беларускім тэатры імя Я. Коласа (кіраўнік студыі, 1931–1933). Лепшыя акцёрскія работы. Праца ва Украіне (рэжысёр тэатраў, 1934–1941). Фарміраванне рэжысёрскага стылю М. Міцкевіча. Лепшыя спектаклі М. Міцкевіча на сцэне тэатра імя Я. Купалы (1951).

Л. М. Літвінаў (Гурэвіч) – рэжысёр. Пачатак творчага шляху (1917). Пастаноўка масавых дзействаў (1921). Вучоба на курсах у Маскве і праца на чале Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра Беларусі (1926–1932, 1942–1943). Спектаклі дакупалаўскага перыяду. Купалаўскі перыяд дзейнасці Л. Літвінава. Выкананне абавязкаў мастацкага кіраўніка і галоўнага рэжысёра (1932–1937, 1943–1948) і рэжысёра (1948–1950) Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы. Лепшыя з работ гэтага перыяду. Удзел у тэатральных дыскусіях 1920–1930-х гг., выступленне ў друку з артыкуламі па праблемах сцэнічнага мастацтва. Праца галоўным рэжысёрам у Казанскім рускім драматычным тэатры. Пастаноўка «Лявоніхі на арбіце» А. Макаёнка (1961).

І. С. Папоў – рэжысёр і педагог. Вучоба ў тэатральным вучылішчы (Архангельск, 1938) і Дзяржаўным інстытуце тэатральнага мастацтва (Масква, 1938–1940). Праца ў расійскіх тэатрах. Пераезд у Беларусь і праца ў Дзяржаўным рускім драматычным тэатры (1947–1948) у якасці рэжысёра, у тэатрах Брэста (1953–1955), Гродна (1955–1963), Віцебска (1963–1965), Гомеля (1966–1974), Мінска (ТЮГ, 1978–1979). Асаблівасці рэжысёрскага стылю Папова. Найбольш значныя спектаклі ў тэатры імя Я. Купалы, у Беларускім рэспубліканскім ТЮГу, тэатры імя Я. Коласа. Педагагічная дзейнасць Папова; узначальванне ім кафедры рэжысуры і майстэрства акцёра (1975–1977; з 1981 – выкладчык) Мінскага інстытута культуры.

Б. У. Эрын – рэжысёр. Вучоба ў тэатральным вучылішчы імя М. Шчэпкіна (1948) і Дзяржаўным інстытуце тэатральнага мастацтва імя А. Луначарскага (1953). Праца ў якасці рэжысёра і галоўнага рэжысёра тэатра імя Я. Купалы (1957 і 1964–1968); Кіеўскага рускага драматычнага тэатра імя Лесі Украінкі (з 1972 г.). Пастаноўкі ў тэатры імя Я.Купалы, у Беларускім рэспубліканскім ТЮГу, тэатры імя Я. Коласа. Вызначальныя рысы рэжысуры Эрына.

В. М. Раеўскі – рэжысёр і педагог, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1976), народны артыст Беларусі (1995). Вучоба

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце (да 1967 г.), праца рэжысёрам (з 1968 г.), галоўным рэжысёрам (з 1973 г.) і мастацкім кіраўніком (з 1991 г.) у Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Я. Купалы. Педагагічная дзейнасць Раеўскага ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў і Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў. Асаблівасць стылю рэжысёра Раеўскага. Праца ў тэатрах розных краін (Тэатр камедыі, Ленінград; Тэатр на Малай Броннай, Масква; Рускі драматычны тэатр, Уфа; Кіеўскі драматычны тэатр імя І. Франко; Тэатр Венгеркі, Беласток; Славенскі нацыянальны тэатр, Марыбар; Рускі тэатр, Талін і інш.).

Б. І. Луцэнка – рэжысёр, педагог, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1975), народны артыст Беларусі (1995). Вучоба ў Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце. Праца рэжысёрам Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы (1967–1973 і 1981–1982), галоўным рэжысёрам Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага рускага тэатра імя М. Горкага (1973–1981, з 1991 – яго мастацкі кіраўнік) і Тэатра-студыі кінаакцёра (1982–1991). Пачатак выкладчыцкай дзейнасці ў Тэатральна-мастацкім інстытуце (з 1970 г.). Фарміраванне стылю Луцэнкі-рэжысёра. Адметнасць рэжысёрскай трактоўкі класічных твораў. Луцэнка – рэжысёр спектакляў, дыяметральна розных па жанрах. Работы Б. Луцэнкі на сцэне НАДРТ імя М. Горкага ў якасці рэжысёра (пачатак XXI ст.).

### *Тэма 5. Рэжысура ў кантэксце сучасных тэатральных працэсаў*

Роля і месца рэжысёрскага мастацтва ў сучасным сцэнічным мастацтве.

Сучасныя тэатры і рэпертуар. Рэжысура П. Брука, Е. Гратоўскага, А. Херманіса, Э. Някрошуса, Ю. Бутусава, П. Фаменкі, К. Сярэбранікава, Н. Чусавай, А. Латэнаса і інш. Новыя напрамкі ў тэатральнай творчасці: saund-drama В. Панкова, Doc.teatr, фолк-тэатр, тэатр вуліцы, «цыркізацыя» тэатра.

Роля цэнтраў і фестываляў тэатральнага мастацтва ў развіцці сучаснай рэжысуры як адметнай прафесійнай дзейнасці (дзейнасць Цэнтра імя Ус. Меерхольда, Цэнтра сучаснай драматургіі і рэжысуры п/к А. Казанцава і М.Рошчына, тэатра «Практыка», фестываляў «Балтыйскі дом», «Белая вежа», «Теарт», «Нацыянальная тэатральная прэмія» і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел II. Тэорыя рэжысуры

*Тэма 6. Рэжысёрскі аналіз п’есы*

Аналіз творчасці аўтара: вывучэнне біяграфіі драматурга, яго думак, поглядаў, інтарэсаў; час і месца творчай дзейнасці аўтара; асноўная тэма, ідэя, «зерне» і звышзадача творчасці драматурга; літаратурна-мастацкія асаблівасці творчасці; асноўныя этапы творчага жыцця аўтара, стылёва-моўныя асаблівасці драматургіі; роля і месца дадзенага твора ў творчай спадчыне; гісторыя пастановак дадзенай п’есы і іх ацэнка крытыкай.

Абгрунтаванне выбару п’есы, яе актуальнасць і навізна гучання менавіта сёння. Першыя ўражанні ад п’есы і іх роля ў стварэнні жанравага і прасторава-гукавога вырашэння спектакля. Даследаванні аб аўтары. Вызначэнне асноўнай тэмы п’есы. Яе канкрэтнасць. Наяўнасць у п’есе галоўнай і другарадных тэм. Сувязь тэмы з ідэяй, звышзадачай, прапанаванымі абставінамі, стылем, жанрам і інш. Роля памылкі ў вызначэнні асноўнай тэмы п’есы. Вызначэнне галоўнай ідэі п’есы. Сувязь галоўнай ідэі п’есы з асноўнай тэмай п’есы і звышзадачай аўтара. Абстрактнасць ідэі як вынік і абагульненне аўтарскай думкі аб дадзеным прадмеце адлюстравання. Непарыўная сувязь тэмы і ідэі, канкрэтнага і абстрактнага, індывідуальнага і агульнага, аб’ектыўнага і суб’ектыўнага. Наяўнасць і вызначэнне (акрамя галоўнай) і другарадных тэм. Вызначэнне прапанаваных абставін п’есы, яе сюжэта і фабулы. Вызначэнне скразнога і контрскразнога дзеяння, іх носьбітаў, вызначэнне канфліктаў (асноўнага і другарадных) і іх носьбітаў. Вызначэнне жанру і стылю п’есы. «Зерне» п’есы. Кампазіцыйная яе пабудова. Асноўныя рэмаркі аўтара і аўтарская характарыстыка дзеючых асоб.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 7. Рэжысёрская задума і эксплікацыя спектакля*

Тэрмін «рэжысёрская задума». Яго паходжанне і сутнасць. Праца над задумай: а) ідэйнае вытлумачэнне (інтэрпрэтацыя) п’есы; б) характарыстыка асобных персанажаў; в) вызначэнне жанравых і стылістычных асаблівасцей акцёрскага выканання ў дадзеным спектаклі; г) рашэнне спектакля ў часе (рытмах і тэмпах); д) рашэнне спектакля ў прасторы (характар мізансцэн і планіровак); е) вызначэнне характару і прынцыпаў музычна-шумавога і мастацка-дэкарацыйнага афармлення.

Разуменне ўзаемасувязей зместу п’есы, яе жанрава-стылістычных асаблівасцей, тыпу пабудовы канфлікту і сцэнічнай формы ўвасаблення. «Вырастанне» ўсіх элементаў задумы спектакля з аднаго агульнага «кораня» – «зерня» п’есы. Вядучая роля скразнога дзеяння і звышзадачы ва ўвасабленні цэласнасці спектакля і супадпарадкаванні ўсіх яго элементаў.

Рэжысёрская эксплікацыя спектакля (дзеяння, карціны): падзея (тэкст), задача кожнага персанажа ў вызначаным эпізодзе, дзеянне, мізансцэнаванне, музычнае і сцэнаграфічнае вырашэнне і інш.

*Тэма 8. Асноўныя этапы работы рэжысёра над спектаклем*

Галоўныя патрабаванні да выбару твора ў мэтах пастаноўкі на сцэнічнай пляцоўцы. Першае ўражанне ад п’есы, яго роля ў жанравым вырашэнні спектакля і яго выкарыстання ў падборы выразных сродкаў і стварэнні зрокавага і гукавога вобразаў спектакля.

Работа рэжысёра з драматычным тэкстам: ад аналізу творчасці аўтара да падрыхтоўкі пастановачнага плана спектакля. Размеркаванне роляў: прынцыпы і падыходы. Чытка па ролях. Рэпетыцыі за сталом («застольны перыяд»). Рэпетыцыі ў «выгарадцы». Рэпетыцыі з выкарыстаннем рэквізіту (яго элементаў), касцюма і інш. Рэпетыцыі на сцэне (па эпізодах і цалкам). Работа рэжысёра з мастаком-сцэнографам, кампазітарам і інш. Рэпетыцыі з выкарыстаннем святла, музыкі, дэкарацый і інш. Прагонныя рэпетыцыі. Генеральная рэпетыцыя. Прэм’ера спектакля. Арганізацыя пасляпрэм’ерных рэпетыцый. Залежнасць работы над п’есай ад матэрыялу, падрыхтаванасці калектыву і складу глядацкай аўдыторыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Боровик, Г. И.* Пьеса, замысел, спектакль: метод. рекомендации по курсу «Режиссура и мастерство актера» для студентов III и IV курсов очного и заочного обучения по специализации «режиссура любительского театра» при написании курсовой работы «Постановочный план спектакля» и постановке дипломной работы / Г. И. Боровик – Минск : Минский ин-т культуры, 1991. – 30 с.

2. *Вахтангов, Е. Б.* Материалы и статьи / Е. Б. Вахтангов. – М. : Искусство, 1959. – 468 с.

3. *Ершов, П. М.* Режиссура как практическая психология / П. М. Ершов. – М. : Искусство, 1972. – 350 с.

4. *Захава, Б. Е.* Мастерство актера и режиссера : учеб. пособие для спец. учеб. заведений культуры и искусства / Б. Е. Захава. – 4-е изд., испр. и доп. – М. : Просвещение, 1978. – 334 с.

5. Искусство режиссуры. XX век / сост. : С. К. Никулин, Л. А. Пичхадзе. – М. : Артист. Режиссер. Театр, 2008. – 768 с.

6. *Кнебель, М. О.* О действенном анализе пьесы и роли : учеб. пособие для театральных вузов / М. О. Кнебель. – М. : Искусство, 1982. – 118 с.

7. *Малочевская, И. Б.* Режиссерская школа Товстоногова / И. Б. Малочевская. – Л. : Искусство, 1989. – 154 с.

8. Мастерство режиссера : сб. ст. / под общ. ред. Н. А. Зверевой. – М. : ГИТИС, 2002. – 472 с.

9. *Мейерхольд, Вс. Э.* Лекции (1918–1919) / сост. О. М. Фельдман. – М. : О.Г.И., 2000. – 280 с.

10. *Мочалов, Ю.* Композиция сценического пространства (Поэтика мизансцены) / Ю. Мочалов. – М. : Искусство, 1989. – 345 с.

11. *Поламишев, А. М.* Мастерство режиссера. Действенный анализ пьесы: учеб. пособие для студентов театр. ин-тов и ин-тов культуры / А. М. Поламишев. – М. : Просвещение, 1982. – 224 с.

12. *Поламишев, А. М.* Мастерство режиссера: от анализа к воплощению : учеб. пособие для высш. и средних спец. учеб. заведений / А. М. Поламишев. – М. : Искусство, 1992. – 312 с. : ил.

13. *Ремез, О. Я.* Мастерство режиссера. Пространство и время спектакля : учеб. пособие для студентов театр. вузов и ин-тов культуры / О. Я. Ремез. – М. : Просвещение, 1983. – 144 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

14. *Станиславский, К. С.* Моя жизнь в искусстве / К. С. Станиславский. – М. : Вагриус, 2000. – 448 с.

15. *Туманишвили, М. И.* Введение в режиссуру: Пока не началась репетиция / М. И. Туманишвили. – М. : Искусство, 1992. – 258 с.

*Дадатковая*

1. *Баравік, Р. І.* Рэжысура Беларусі : праблемы канцэптуальнасці спектакляў / Р. І. Баравік. – Мінск : Беларус. ун-т культуры, 2000. – 143 с.

2. *Бармак, А.* Художественная атмосфера спектакля / А. Бармак. – М. : Искусство, 1989. – 186 с.

3. *Брехт, Б.* О театре: сб. ст. / Б. Брехт. – М. : Изд-во иностр. лит., 1960. – 363 с.

4. *Брук, П.* Пустое пространство / П. Брук. – М. : Прогресс, 1976. – 240 с.

5. *Галендеев, В. Н.* Метод и школа Льва Додина / В. Н. Галендеев. – СПб. : Изд-во СПГАТИ, 2004. – 80 с.

6. *Гаробчанка, Т. Я.* Тэатр на мяжы стагоддзяў: сучасны беларускі драматычны тэатр / Т. Я. Гаробчанка. – Мінск : Беларус. навука, 2002. – 367 с.

7. *Горчаков, Н. М.* Как поставить спектакль / Н. М. Горчаков. – М. : Гос. изд-во культ.-просвет. лит., 1955. – 83 с.

8. *Зверева, Н. А.* Замысел спектакля / Н. А. Зверева. – М. : Сов. Россия, 1983. – 112 с. – (Б-ка «В помощь худож. самодеятельности», № 10).

9. *Кнебель, М. О.* Поэзия педагогики / М. О. Кнебель. – М. : ВТО, 1984. – 526 с.

10. *Мусский, И. А.* Сто великих режиссеров / И. А. Мусский. – М. : Вече, 2004. – 468 с.

11. *Немирович-Данченко, Вл. И.* Театральное наследие : в 2 т. / Вл. И. Немирович-Данченко. – М. : Искусство, 1952–1954. – Т. 1 : Статьи. Речи. Беседы. Письма / ред.-сост. В. Я. Виленкин. – 1952. – 442 с. : ил.

12. *Попов, А. Д.* Творческое наследие : в 3 кн. / редкол.: Ю. С. Калашников [и др.] ; вступ. ст. Ю. С. Калашникова. – М. : ВТО, 1979 – 1986. – Кн. 1: Воспоминания и размышления о театре. Художественная целостность спектакля. – 1979. – 519 с. : ил.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*13.* Режиссерский театр: от Б до Ю: Разговор под занавес века: сб. ст. /авт. проекта ред.-сост. А. Смелянский, О. Ожогина. – М. : Моск. худож. театр, 1999. – Вып. 1. – 530 с. : ил.

*14. Ремез, О. Я.* Мизансцена – язык режиссера / О. Я. Ремез. – М. : Искусство, 1976. – 127 с.

*15. Рехельс, М.* Режиссер – автор спектакля / М. Рехельс. – Л. : Искусство, 1969. – 123 с.

*16. Рудницкий, К. Л.* Русское режиссерское искусство : в 2 кн. / К. Л. Рудницкий (1898–1907; 1908–1917). – М. : Наука, 1989–1990. – Кн. 1. – 384 с. ; кн. 2. – 279 с.

*17. Сапегин, Б. В.* Введение в режиссуру: учеб. пособие / Б. В. Сапегин. – СПб. : Акад. культуры, 1997. – 131 с.

*18. Смолина, К.* Сто великих театров мира / К. Смолина. – М. : Вече, 2002. – 480 с.

*19.* Станиславский репетирует : Записи и стенограммы репетиций / Моск. худож. акад. т-р им. А. П. Чехова ; сост., ред. и авт. вступ. ст. к разделам И. Н. Виноградская. – 2-е изд., испр. и доп. – М. : Моск. худож. театр, 2000. – 520 с. : ил.

*20. Сулимов, М. В.* Посвящение в режиссуру / М. В. Сулимов. – СПб. : Изд-во СПбГУ, 2004. – 576 с.

*21.* Сучасная беларуская рэжысура : Пошукі мастацкай адметнасці ў кантэксце традыцый еўрапейскага тэатра: зб. матэрыялаў Міжнар. навук.-творч. канф., Гродна, 6–17 кастр. 1997 г. / адк. рэд. Р. Б. Смольскі. – Мінск: Арты-фэкс, 1998. – 314 с.

*22. Таиров, А. Я.* Записки режиссера. Статьи. Беседы. Речи. Письма / А. Я. Таиров. – М. : ВТО, 1970. – 602 с.

*23.* Творческое наследие Вс. Э. Мейерхольда: сб. ст. / ред.-сост.: Л. Д. Вендровская, А. В. Февральский. – М. : ВТО, 1978. – 488 с. : ил.

*24. Товстоногов, Г. А.* Зеркало сцены : в 2 кн. / Г. А. Товстоногов. – Л. : Искусство, 1980. – Кн. 1 : О профессии режиссера. – 303 с.

*25. Товстоногов, Г. А.* Зеркало сцены: в 2 кн. / Г. А. Товстоногов. – Л. : Искусство, 1980. – Кн. 2 : Статьи. Записи репетиций. – 311 с.

*26.* Тэатральная Беларусь : энцыкл. : у 2 т. / пад агул. рэд. А. В. Сабалеўскага. – Мінск : БелЭн, 2002–2003. – Т. 1 : А – К – 2002. – 568 с. : іл. ; т. 2 : Л – Я – 2003. – 576 с.

*27. Эфрос, А.* Профессия: режиссер / А. Эфрос. – М. : Вагриус, 2000. – 274 с.

*28. Эфрос, А.* Репетиция – любовь моя / А. Эфрос. – М. : Искусство, 1975. – 319 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі вучэбнай дзейнасці студэнтаў

Для дыягностыкі прафесійнай кампетэнцыі, кантролю і самакантролю ведаў студэнтаў кафедры тэатральнай творчасці па вучэбнай дысцыпліне «Тэорыя і гісторыя рэжысуры» выкарыстоўваецца дыягнастычны інструментарый, які мае рознаўзроўневы характар і выкарыстоўваецца комплексна:

1. Творчыя заданні па гісторыі і тэорыі рэжысёрскага мастацтва, якія прадугледжваюць аналітычную працу з першакрыніцамі (манаграфіі, тэарэтычныя працы па тэорыі і гісторыі рэжысуры, рэжысёрскія экзэмпляры К. С. Станіслаўскага, Ус. Э. Меерхольда і інш.).
2. Падрыхтоўка вусных выступленняў перад аўдыторыяй па пытаннях тэорыі і гісторыі рэжысуры (магчыма з мультымедыйнай прэзентацыяй).
3. Азнаямленне з публікацыямі вядучых беларускіх рэжысёраў, вусны аналіз гэтых артыкулаў.
4. Выступленні на семінарах па падрыхтаваных студэнтамі тэмах.
5. Вуснае апытанне студэнтаў у час правядзення практычных і семінарскіх заняткаў.
6. Падрыхтоўка рэферата па абранай тэматыцы.
7. Залік.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работа студэнтаў кафедры тэатральнай творчасці па вучэбнай дысцыпліне «Тэорыя і гісторыя рэжысуры» мэтанакіравана на паглыбленне ведаў і абуджэнне студэнтаў да актывізацыі творчай дзейнасці. Самастойная работа ўключае ў сябе наступныя формы:

– падрыхтоўка да лекцый, практычных, семінарскіх заняткаў і да залікаў;

– вывучэнне асноўнай і дадатковай літаратуры па тэорыі і гісторыі рэжысуры;

– падрыхтоўка вусных выступленняў, дакладаў, рэфератаў, мультымедыйных прэзентацый па праблемах тэорыі і гісторыі рэжысуры;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– праца з першакрыніцамі па пытаннях тэорыі і гісторыі рэжысуры ў бібліятэках г. Мінска;

– аналіз Internet-крыніц па праблемах беларускай і сусветнай тэорыі і гісторыі рэжысуры.

Для ацэнкі якасці самастойнай работы студэнтаў ажыццяўляецца пастаянны кантроль за яе выкананнем. Формы кантролю самастойнай работы: гутарка, апытанне, кансультаванне па стварэнні мультымедыйных прэзентацый і выбары тэматыкі і падбору матэрыялу для падрыхтоўкі рэферата або вуснага адказу на практычных і семінарскіх занятках.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ТЭОРЫЯ І ГІСТОРЫЯ РЭЖЫСУРЫ**

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці*
*1-18 01 01-03 Народная творчасць (тэатральная)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. Д. Захарэвіч

Падпісана ў друк 2014. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,16. Ул.-выд. арк. 0,82. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ